■ Выбары-2016: праграмы кандыдатаў

## ПЕРАДВЫБАРНАЯ ПРАГРАМА

### КАНДЫДАТА Ў ДЭПУТАТЫ ПАЛАТЫ ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА КАЛІНОЎСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ №108 ГУБАРЭВІЧА ЮРЫЯ ІВАНАВІЧА



Нарадзіўся 23 лютага 1978 года ў Белаазёрску Брэсцкай вобл.

Магістр дзяржаўнага кіравання, па першай адукацыі інжынер-электрык.

Працаваў рэгіянальным прадстаўніком ЗАТ «АНК Белраснафтахімрэсурс», намеснікам дырэктара аналітычнага аддзела ГА «МІА «Еўрапейская хваля», дырэктарам РВПУ «Палард», цяпер — індывідуальны прадпрымальнік.

У 2003 годзе абіраўся дэпутатам Белаазёрскага гарсавета, быў намеснікам старшыні.

2007—2009 гг. — намеснік старшыні Партыі БНФ.

2007—2016 гг. — намеснік, першы намеснік старшыні Руху «За Свабоду».

Жанаты, мае дзвюх дачок.

Дарагія суайчыннікі! Улады не пытаюцца нас, калі прымаюць новыя законы аб падвышэнні пенсійнага ўзросту альбо адмене льгот. Скарачаюць працоўныя месцы і ўводзяць збор на дармаедства замест таго, каб дапамагчы людзям знайсці новую працу. У Палаце прадстаўнікоў сядзяць дэпутаты, якія аднагалосна галасуюць за тое, што выгадна ўладам, а не беларускаму народу. Я гатовы стаць вашым голасам у парламенце, адстойваць вашы інтарэсы і працаваць на карысць Беларусі.

**Рэформы. Дабрабыт. Мір**

Мая каманда выступае за эканамічныя рэформы, за стварэнне новых працоўных месцаў і забеспячэнне годных заробкаў і пенсій, за барацьбу з карупцыяй і разняволенне дзелавой ініцыятывы. Мы даўно працуем над гэтым і ведаем, як гэта зрабіць — маем гатовыя праекты рэформаў. Так, мы прапануем пераход да накапляльнай пенсійнай сістэмы, дзе вы самі здольныя ўплываць на памер вашай пенсіі.

Мы таксама маем праект пераходу на страхавую медыцыну, якая забяспечыць вам лепшую якасць пры захаванні даступнасці. Больш падрабязна пра нашы напрацоўкі, скіраваныя на павышэнне вашага дабрабыту, можна прачытаць на сайце «Народнай праграмы» (prahrama.by).

**Барацьба з беспрацоўем і дастойны заробак**

Беларусы працуюць, як еўрапейцы, і павінны атрымліваць заробкі і сацыяльныя гарантыі еўрапейскага ўзроўню. Даступная страхавая медыцына. Створым эканамічныя ўмовы для вяртання беларусаў, што працуюць за мяжой. Мы маем праграму па стварэнні новых працоўных месцаў, якія гарантуюць годныя заробкі.

Абавязак дзяржавы падрыхтаваць запатрабаваныя кадры, якія б былі канкурэнтаздольныя на беларускім і замежным рынках. Гэта вымагае рэформы адукацыі з акцэнтам на гарантаванае валоданне выпускнікамі школ замежнымі мовамі і стажыроўкі студэнтаў у еўрапейскіх універсітэтах. Навучэнцы адразу павінны нацэльвацца на атрыманне набору ведаў, неабходных для канкрэтнай прафесіі.

**Экалогія. Севастопальскі парк**

Севастопальскі парк — лёгкія Першамайскага раёна Мінска. Яшчэ нашы бацькі закладвалі парк і хацелі захаваць яго для нашчадкаў. Амаль 20 гадоў цягнецца змаганне грамадзян за Севастопальскі парк. То цеплатраса, то кабельная лінія, то спроба распачаць элітную забудову, то пагражалі закрыццём артэзіянскіх свідравін...

Я і мае аднадумцы з Руху «За Свабоду» падтрымлівалі жыхароў у абароне парку. Супольнымі намаганнямі мы прымусілі мясцовае кіраўніцтва пераглядзець частку планаў па яго руйнаванні. Я лічу, што патрэбен дэталёвы план рэканструкцыі Севастопальскага парку, узгоднены з незалежнымі эколагамі і жыхарамі прылеглых мікрараёнаў Мінска.

**Свабода і еўрапейскі выбар**

У мяне за спінай Рух «За Свабоду» і Праваабарончая... Правацэнтрысцкая кааліцыя. Мы разам вылучылі 90 кандыдатаў.

Мы выступаем за еўрапейскі выбар Беларусі як спосаб адстойвання нашых нацыянальных інтарэсаў і гарантыю ўстойлівага развіцця дзяржавы і грамадства. У падмурку нашай праграмы — свабода і годнасць асобы, дэмакратычнае ўладкаванне Беларусі, падтрымка беларускай мовы і нацыянальных традыцый.

**Кандыдат №1 у выбарчым бюлетэні**

Дарагія выбарцы, спадзяюся на вашу падтрымку. Заклікаю вас: калі хочаце перамен, прыходзьце і галасуйце за мяне, Юрыя Губарэвіча!

## ПЕРАДВЫБАРНАЯ ПРАГРАМА

### КАНДЫДАТА Ў ДЭПУТАТЫ ПА КОЛАСАЎСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ № 106 ГАЦАКА МАКСІМА ВІКТАРАВІЧА

# «БЕЛАРУСЬ ПАТРАБУЕ ПЕРАМЕН. АЛЬТЭРНАТЫВА ЁСЦЬ»



**Дарагія суайчыннікі!**

11 верасня нам трэба выбраць шлях развіцця нашай краіны на бліжэйшыя чатыры гады. Ад гэтага рашэння залежыць будучыня нашых дзяцей і ўнукаў, будучыня незалежнай Беларусі.

Чыноўнікі ўсё больш залазяць у кішэні беларусаў: уводзяць новыя падаткі, павышаюць камунальныя тарыфы, змяншаюць заробкі і павялічваюць пенсійны ўзрост. Некалькі гадоў улады не могуць вывесці эканоміку з крызісу. Чыноўнікі адбіраюць у нашых дзяцей будучыню — бяруць крэдыты за мяжой для захавання сваіх пасадаў і правядзення наменклатурных з'ездаў. Аддаваць гэтыя крэдыты яны будуць з нашых сямейных бюджэтаў. Беларусі патрэбны перамены і рэформы, каб вярнуць нашым дзецям надзею на будучыню!

**Хто такі Максім Гацак?**

28 гадоў. Жанаты. Выхоўвае дваіх дзяцей. Па поглядах — хрысціянскі дэмакрат.

Незалежны журналіст. Індывідуальны прадпрымальнік.

Скончыў ліцэй БДУ, факультэт міжнародных бізнес-камунікацый БДЭУ. Прызёр рэспубліканскіх алімпіяд па гісторыі.

Адзін са стваральнікаў і галоўны рэдактар хрысціянскага інфармацыйнага партала KRYNICA.INFO.

Намеснік старшыні аргкамітэта Хрысціянска-дэмакратычнага руху.

**Чаму балатуюся па вашай выбарчай акрузе?**

Разам з іншымі хрысціянскімі дэмакратамі мы шмат зрабілі для таго, каб у нашым горадзе было зручна жыць кожнай беларускай сям'і. Зараз мы змагаемся за абмежаванне рэкламы алкаголю, чыстую ваду і перавод Мінска на артэзіянскія крыніцы водазабору.

**Як вывесці эканоміку з крызісу?**

Беларускія хрысціянскія дэмакраты сумесна з экспертамі распрацавалі праект сістэмных рэформаў у эканоміцы, ахове здароўя, ЖКГ, пенсіях і іншых сферах. Мы ўпэўнены, што ўсю сістэму трэба мяняць ужо зараз.

**НОВАЯ ЭКАНОМІКА: інвестыцыі і працоўныя месцы з годнымі заробкамі**

› Прыцягненне сродкаў эмігрантаў і замежных інвестараў у новыя сектары эканомікі (IT-індустрыя). Продаж стратных прадпрыемстваў інвестарам для мадэрнізацыі вытворчасцяў.

› Развіццё малога і сярэдняга бізнесу (адмена сертыфікатаў, існуючых штрафаў і праверак; гадавыя патэнты, найм работнікаў без абмежаванняў).

› Мінімальная падатковая нагрузка на бізнес і адмена датацый дзяржсектару, развіццё фермерскіх гаспадарак за кошт уваздзення прыватнай уласнасці на зямлю для грамадзян Беларусі.

**ЖКГ: якасныя паслугі з прымальнымі тарыфамі**

› Магчымасць выбару паміж прыватнай або дзяржаўнай арганізацыяй, якая абслугоўвае дом. Канкурэнцыя знізіць кошт і павысіць якасць абслугоўвання.

› Скарачэнне чыноўнікаў у аддзелах ЖКГ і ў міністэрстве.

› Скарачэнне бюджэтных датацый на ЖКГ. Прыватызацыя стратных лазняў, цырульняў, гасцініц і хімчыстак.

**АХОВА ЗДАРОЎЯ: новае абсталяванне і якаснае лячэнне**

› Адмена платных паслуг у дзяржаўных установах аховы здароўя. Развіццё прыватных медыцынскіх цэнтраў.

› Страхавая медыцына: дзяржава і прадпрыемствы размяшчаюць на рахунак кожнага грамадзяніна страхавую суму, а чалавек самастойна абірае доктара і аплачвае яго паслугі са свайго рахунку.

› Павелічэнне выдаткаў на медыцыну за кошт адлічэнняў у фонд абавязковага медыцынскага страхавання сродкаў ад абароту спіртных напояў, тытунёвых вырабаў, ігральнага бізнесу, штрафаў за экалагічныя парушэнні.

**ПЕНСІІ: годнае жыццё, павага і клопат**

› Увядзенне абавязковых накапляльных пенсій. Кожны ўласнік сродкаў у накапляльным фондзе самастойна распараджаецца сваімі накапленнямі.

› Перадача ў накапляльны пенсійны фонд 25% сродкаў ад прыватызацыі. Інвеставанне сродкаў у паспяховыя вытворчасці, што забяспечыць выплаты сённяшнім пенсіянерам. Старэйшае пакаленне мае права на сваю долю ў створаным іх рукамі нацыянальным багацці краіны.

› Аднолькавы ўзрост выхаду на пенсію і памер пенсійных выплат для чыноўнікаў, настаўнікаў, рабочых, сілавікоў.

Для таго каб дабіцца перамен, новых працоўных месцаў з годнымі заробкамі і пенсіямі, трэба ваша дапамога. Не дайце сфальсіфікаваць выбары — удзельнічайце ў незалежным назіранні! Кантактны тэл.: 8-029-167-34-35, bchd.info@gmail.com, http://bchd.info

■ Наша марка

# ЯКАСЦЬ І КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАСЦЬ — СЭНС ВЫТВОРЧАСЦІ

## У Брэсце адкрылі новы завод па выпуску дарожнай разметкі



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль Ліс знаёміцца з прадукцыяй новага завода.

**Група кампаній «СТіМ» даўно зарэкамендавала сябе ў якасці сур'ёзнага вытворцы свабоднай эканамічнай зоны «Брэст». На яе заводах выпускаюцца амаль усе віды матэрыялаў для дарожнай разметкі. Прадукцыю з брэсцкай маркай добра ведаюць партнёры як у далёкім, так і ў блізкім замежжы.**

І вось у мікрараёне Кацін Бор урачыста адкрылі яшчэ адзін завод названай групы кампаній. Тут вырабляюць тэрмапластыкі. Як патлумачыў генеральны дырэктар «СТіМ» Дзмітрый ЧАРНЕНКА, для кампаніі, якая выпускае шырокі спектр разметачнай прадукцыі, новы завод тэрмапластыкаў стаў лагічным працягам у справе развіцця вытворчасці.

Асноўай тэрмапластыкаў з'яўляюцца поліэфіры. У іх саставе адсутнічаюць растваральнікі і лятучыя матэрыялы, што дазваляе зводзіць да мінімуму шкоднае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе. І гэта вельмі важна ў наш час. Яшчэ адзін фактар, які іграе рашаючую ролю для выбару тавару пакупніком, — трываласць тэрмапластыкаў. Разметка з такога матэрыялу праслужыць у разы даўжэй, чым рысунак, нанесены фарбай. Яна здольная вытрымліваць актыўны рух на дарозе, у тым ліку вялікага па масе транспарту.

Пасля ўрачыстага разразання сімвалічнай стужкі гаспадары прадпрыемства правялі гасцей па новых цэхах, паказалі машыны і абсталяванне, на якім асвоена вытворчасць новай прадукцыі.

— Мы адмовіліся ад закупак многіх імпартных кампанентаў, — гаварыў падчас экскурсіі Дзмітрый Чарненка. — Раней смолы для фарбаў набывалі ў ЗША і Японіі, а сёння вырабляем іх у сябе. А, напрыклад, шклашарыкі нам пастаўлялі вытворцы Англіі і Францыі, цяпер мы і самі прапануем іх замежным пакупнікам.

У новы завод кампанія інвеставала каля пяці мільёнаў еўра. На будаўніцтва, згодна з планам, адводзілася 12 месяцаў, але памяшканне ўвялі ў строй значна раней за ўказаны тэрмін. Ужо ўстаноўлены і наладжаны ўсе вытворчыя лініі. Абсталяванне набывалася ў Эстоніі, Бельгіі, Даніі. Амаль 80 працэнтаў прадукцыі, што сыходзіць з канвеераў, накіроўваецца ў Расійскую Федэрацыю і еўрапейскія краіны.

Увод у строй новага прадпрыемства, вядома, азначае стварэнне новых рабочых месцаў. Але іх нямнога. Увесь цыкл завязаны на аўтаматыцы. Людзі толькі сочаць за параметрамі машын.

Павіншаваць калектыў групы кампаній «СТіМ» з адкрыццём новага завода прыехаў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС. Губернатар адзначыў, што ў гэтай вытворчасці мы маем прыклад самага сучаснага прадпрыемства. Выпускаць якасны канкурэнтаздольны тавар, які запатрабаваны на знешнім і ўнутраным рынках, — у гэтым і заключаецца сэнс сённяшняй вытворчасці.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

■